# РАЗДЗЕЛ 3
# ГЕРОЙ І ЧАС У ТВОРЧАСЦІ ІВАНА ШАМЯКІНА

## АПОВЕСЦЬ І. ШАМЯКІНА «САТАНІНСКІ ТУР»: АСАБЛІВАСЦІ МАСТАЦКАГА СВЕТУ ТВОРА

**А. М. Макарэвіч**

*Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова,*
*вул. Касманаўтаў, 1, 212022, Магілёў, Беларусь, olektak@mail.ru*

Артыкул прысвечаны рагзляду мастацкіх асаблівасцяў аповесці вядомага беларускага пісьменніка Івана Шамякіна «Сатанінскі тур». Паказана, што дадзеная аповесць – гэта мастацкі паказ не толькі аднаго прыватнага трагічнага факта, які меў месца ў прататыпнай рэчаіснасці. Гэта погляд аўтара на вынікі сацыяльнага бязладдзя ў іх татальных уплывах на лёсы людзей. Аднак маральнае супрацьстаянне ў грамадстве ўсё ж можа мець пазітыўныя вынікі. Адпаведна для чалавека яно не праходзіць безвынікова.

***Ключавыя словы***: Іван Шамякін; аповесць «»Сатанінскі тур»; дзённікаввыя запісы; мастацкі свет; сістэма вобразаў; літаратурны герой.

Аповесць «Сатанінскі тур» (1993) была створана на падставе рэальнага факту з прататыпнай сацыяльнай разбуральнай прасторы, што было зафіксавана пісьменнікам у яго дзённікавым запісе ад 11 студзеня 1993 года [1, с. 432]. Трагічны жыццёвы «сюжэт» пра нялюдскае вандраванне аўтобуса з гандлярамі і памерлым у ім чалавеку па Беларусі і Польшчы, агучаны па расійскім тэлебачанні, пісьменнік амаль цалкам пераносіць у літаратурны тэкст, напаўняючы мастацкую яго прастору

адпаведнымі характарамі, прычынна-выніковымі сувязямі і вывадамі (часцей апасродкаванымі) агульначалавечага зместу.

Тут дарэчы адзначыць, што падобны па яго сутнасці жыццёвы выпадак паўтарыўся ў 2012 годзе ў Хабараўску (пра яго было распаведзена на расійскім канале 29.02.2012 у перадачы «Прямой эфир с Михаилом Зеленским»). Каб не згубіць «выручку», вадзіцель і кандуктар пяць гадзін «каталі ў аўтобусе па ўсім горадзе» прафесара Далёкаўсходняга ўніверсітэта Уладзімера Акімава, які ў аўтобусе страціў прытомнасць. Вынік – пасля доўгіх дзён у коме чалавек памёр.

Падзеі аповесці «Сатанінскі тур» адбываюцца на працягу чатырох-пяці дзён. Яны разгортваюцца ў наступных падзейных плоскасцях: а) падрыхтоўка да паездкі ў Польшчу на гандаль Уладзіслава – у кватэры Булаўскіх; б) уласна паездка – у Віцебску на месцы збору «турыстаў», у час паездкі – у аўтобусе, на Брэсцкай мытні, на Тамашоўскім і Варшаўскім рынках у Польшчы, на Варшаўскім вакзале, па дарозе ў Брэст, каля аддзела міліцыі ў Брэсце; в) пахаванне Уладзіслава Булаўскага – у Віцебску.

Сістэма вобразаў аповесці прадстаўлена некалькімі групамі літаратурных герояў. Рэальны план: а) Уладзіслаў Булаўскі, яго сям’я, суседка Ларыса; б) удзельнікі «турыстычна»-гандлярскага тура (у тым ліку і Булаўскі); в) беларускія і польскія мытнікі, пагранічнікі; г) палякі – пакупнікі на Тамашоўскім рынку, Пан Юзаф – пакупнік Узёнтакавага тавару ў Варшаве; д) прысутныя на пахавальным развітанні з Булаўскім. Рэтраспекцыйны план: а) сябры Булаўскага (Саша Кукліч і яго жонка), родныя Марыны (бацькі, брат і сястра) і Уладзіслава (маці); б) калегі па працы Булаўскага.

Характары адных літаратурных герояў, іх адносіны да падзей, што разгортваюцца ў аповесці, раскрываюцца ў асноўным у кантэксце тых эпізодаў, якія выразна прадвызначаюць дзеянні другіх герояў. Дынамізм развіцця сюжэта ўплывае на асаблівасці раскрыцця вобразаў твора: вынікі ўчынкаў літаратурных герояў, падставай для якіх з’яўляецца адпаведная іх жыццёвая пазіцыя, не

прымушаюць сябе доўга чакаць. Тут адно ўшчыльную і амаль імгненна счэпліваецца, пераплятаецца з другім. Ствараецца такое ўражанне, што кожны з герояў аказваецца ў «патрэбным» месцы і ў «патрэбны» час, каб выканаць нейкую ўласцівую толькі яму функцыю, якую б другі герой, калі б першага тут не было, не здзейсніў.

Такімі героямі і – адпаведна – іх дзеяннямі з'яўляюцца наступныя. Марынін брат Іван – прывёз Булаўскім злашчасны спірт. Настаўнік хіміі Саша Кукліч – арганізаваў тур для Уладзіслава. «Стараста» ў аўтобусе, а фактычна арганізатар паездкі Леанід Узёнтак – калі б на яго месцы аказаўся нехта іншы, усё магло б адбывацца інакш. Начальнік змены мытнікаў у Брэсце Кастусь – спланавана стварыў спрыяльныя ўмовы для перасячэння мяжы гандлярамі ў сітуацыі відавочнай анамальнасці фактаў, якія суправаджаюць гэтае перасячэнне. Андрэй Шых і адвакат Паноў з іх дзеяннямі – гэта своеасаблівы вынік адпаведнай сатанінскай задумы: менавіта яны падпіхнулі Узёнтака да канчатковага здзяйснення страшнага сатанінскага плану. Цётка Дуся – спрыяла праяўленню (хай сабе і вонкаваму) чалавечнасці ў гандляроў. Пан Юзаф – яго нез'яўленне на сустрэчу з Узёнтакам дзеля набыцця кантрабанднага тавару справакавала адпаведныя паводзіны «старасты». Уладзіслававa вучаніца Ядзя Кажура – яе спазненне ў аўтобус пасля наведвання музея выклікала ў вадзіцеля Валодзі Адамейкі глыбокае нервовае напружанне, а затым (ужо як вынік) і бунт супраць Узёнтака, а таксама далейшае імклівае развіццё падзей. Рэкеціры Капыток і Язькоў – іх рабаўніцтва выклікала бунт аптэкаркі Сіўцовай, вынікі якога затым паспяхова ёю былі выкарыстаны на мытні ў час перасячэння мяжы ўжо ў працэсе вяртання ў Беларусь. Аптэкарка Сіўцова – яе ўдалы гандаль лекамі, спроба абараніць найперш сябе перад рэкецірамі і затым тэатралізаваная істэрыка на польскай і беларускай мытні спрыялі хуткаму вяртанню ў Брэст. Вадзіцель Станіслаў Валевіч – яго адмаўленне ад уласнай пазіцыі «мы [толькі. – А. М.] – возчыкі» садзейнічае пакаранню Узёнтака. Рабочая швейнай фабрыкі Тася – яе дзеянні ў адносінах да жывога і памерлага Уладзіслава, да ацэнкі гэтай трагедыі і

ўласнага ўдзелу ў ёй – гэта своеасаблівы маральна накіраваны найперш у свядомасць рэцыпіента праменьчык, спроба аўтара паставіць важны ідэйны акцэнт у адносінах да падзей «сатанінскага тура».

Такое размеркаванне рухаючых сіл у мастацкай прасторы аповесці невыпадковае. Яно з'яўляецца вынікам пэўных жыццёвых пазіцый, да якіх (найбольш рэтраспекцыйна) адсылае пісьменнік у адпаведных падзейных сітуацыях. Тут няма нічога выпадковага, як бы гэта ні гучала жорстка ў такім вызначэнні.

У сувязі з прыведзеным вышэй сцверджаннем пра з'яўленне герояў аповесці ў «патрэбным» месцы і ў «патрэбны» час можна адзначыць наступнае: большасці з іх у мастацкай прасторы твора ўжо была прадвызначана свая спецыфічная роля ў падрыхтоўцы да гэтага тура і ў яго здзяйсненні. Прадвызначана кім? Часткова адказ утрымліваецца ў назве аповесці: «Сатанінскі тур», а таксама ў аўтарскай заўвазе ў кантэксце эпізоду, калі вырашалася пытанне, ці вяртацца назад у Віцебск з памерлым Булаўскім, ці ехаць далей, у Польшчу («Даўно вядома: сатанінская прапанова, задума нярэдка штурхае людзей, паміма волі іх, на такое ж сатанінскае здзяйсненне» [2, с. 313]).

Суаднясенне з'яў грамадскага жыцця 1990-х гадоў, зафіксаваных у дзённіках І. Шамякіна, з фактамі аповесці (безграшоўе, дэфіцыт, выродлівыя формы выжывання ў такіх умовах і інш.), аўтарскімі заўвагамі да знешнасці, учынкаў некаторых герояў (напрыклад, Шыха, Панова і інш.) прыводзяць да наступнай думкі. «Сатанінскі тур» – гэта акт двухпланавага вымярэння. З аднаго боку, ён успрымаецца як існаванне людзей 90-х гадоў XX ст. у Беларусі, якое правакавала на выяўленне не самых лепшых пачуццяў, памкненняў, дзеянняў гэтых людзей. З другога боку – гэта непасрэдна «турыстычна»-гандлярскі тур, у час якога максімальна праявіліся вынікі не толькі асаблівасцей сацыяльнага існавання яго ўдзельнікаў, а і патэнцыйныя схільнасці ў іх характарах і адносінах да свету. І вось менавіта ў гэтым туры былі сабраны прадстаўнікі тых сацыяльных груп, якія ў паказальнасці іх маральных якасцей на ўзроўні большасці (пераважная частка

гандляроў) ці меншасці (Уладзіслаў Булаўскі, вучаніца Ядзя, вадзіцель Валодзя Адамейка) з'явіліся той лакмусавай паперкай, што сведчыла пра магчымасці грамадства ў садзейнічанні альбо супрацьстаянні сатанінскай задуме адносна чарговага выпрабавання для народа, у прыватнасці народа Беларусі.

Асноўнымі асаблівасцямі раскрыцця альбо ў цэлым характараў літаратурных герояў, іх адносін да жыцця, альбо адлюстравання праяў іх характараў у кантэксце прыватных эпізодаў у час тура з'яўляюцца наступныя.

*Рэтраспекцыі* – сведчанні, успаміны герояў аб іх мінулым жыцці (Уладзіслаў Булаўскі, яго жонка Марына); непасрэдныя характарыстыкі адных герояў другімі (брат і сястра Марыны ў адносінах да сям'і Булаўскіх); аўтарскія заўвагі аб фактах мінулага жыцця ўдзельнікаў тура (Леаніда Узёнтака, Ядзі Кажуры, Тасі і Марусі, вадзіцелей Станіслава Валевіча і Валодзі Адамейкі, начальніка змены мытнікаў Кастуся); *рэальны план дзеяння* – непасрэдныя ацэнкі, характарыстыкі і назіранні літаратурных герояў (Булаўскі, Марына, Узёнтак, Тася, Адамейка); выказванні, ацэнкі, разважанні літаратурных герояў адносна падзей тура (Булаўскі, Марына, Узёнтак, Шых, Паноў, Тася, Валодзя Адамейка, Дуся, аптэкарка Сіўцова, прадстаўніца Узёнтакавай фірмы Ірэна Шостак); непасрэдна ўчынкі літаратурных герояў – найбольш выразна характарызуюць адпаведных дзеючых асоб як здзяйсняльнікаў той ці іншай місіі, ускладзенай на іх у гэтым туры.

Асаблівасці мастацкай канстатацыі праблем, іх раскрыцця ў наступным. Спачатку аўтар акрэслівае надзённыя пытанні грамадскага жыцця з дапамогай непасрэднай формы іх адлюстравання: праз выказванні, разважанні літаратурных герояў альбо аўтарскія каментарыі. Затым гэтыя ж самыя праблемы ілюструюцца і развіваюцца ў адпаведным падзейным кантэксце.

Сярод актуальных пытанняў грамадскага жыцця, адлюстраваных у аповесці, якія сведчаць пра шматаспектнасць праблемнага поля дадзенай аповесці, наступныя:

1) крушэнне маралі ва ўмовах татальнага спажывецкага дэфіцыту;

2) імкненне пасрэднасці ўзысці на сацыяльны верх;

3) прыстасаванне былых і цяперашніх лідараў да новых умоў жыцця і адмаўленне пры гэтым ад ідэалаў, якія яны раней прапагандавалі;

4) вызначэнне вартасці (уяўнай і сапраўднай) чалавека;

5) адноснасць маральнага і амаральнага ў сітуацыі маральнага выбару;

6) адноснасць маральнай адказнасці;

7) салідарнасць у натоўпе як супрацьпастаўленне вечнай значнасці агульначалавечых каштоўнасцей;

8) схільнасць натоўпу даваць нагоду для суб'ектыўнага яго ўспрымання як «быдла»;

9) схільнасць да здрады сваіх (хаўруснікаў) сярод сваіх;

10) імкненне ва ўмовах дэфіцыту да здзяйснення бізнесу любым шляхам;

11) здзяйсненне побытавых маральных ацэнак з пазіцыі двайных стандартаў ва ўмовах натоўпавай салідарнасці;

12) зварот да Бога ў трагічных абставінах жыцця як спроба аберагчы сябе і іншых ад яшчэ большай бяды ў сітуацыі, калі адсутнічае надзея на дапамогу ад людзей;

13) імкненне да выратавання праз розныя па сваёй сутнасці ўчынкі: пратэст, пакаянне, пакаяннае змірэнне.

Спрыяючы канчатковаму развіццю сатанінскай задумы, героі аповесці садзейнічаюць не толькі здзяйсненню канчатковых – трагічных – эпізодаў у жыцці Булаўскага, але і ў лёсе іншых людзей (у тым ліку і ўласным): у жыцці жонкі і дачкі галоўнага героя, у лёсе кіраўніка тура Узёнтака, гандляркі Тасі, гіпатэтычна – у лёсе вучаніцы Булаўскага Ядзі, вадзіцеля аўтобуса Валодзі і інш.

Амаль кожны з герояў аповесці сваімі ўчынкамі ўскосна спрыяе набліжэнню апошніх гадзін у жыцці Уладзіслава Булаўскага, апошніх дзён існавання яго (ужо нежывога) у такім няўтульным свеце. Гэта і маці галоўнага

героя, якая не перашкаджала сыну хаваць яго смяротную хваробу, і жонка, якая не заўважала відавочных праяў пароку сэрца ў мужа, і калегі па працы, якія таксама не надавалі належнай увагі паказальным праявам хваробы Булаўскага, – усё гэта факты рэтраспекцыйнага плану. У рэальным жа часе лёс Уладзіслава вырашаецца збегам абставін, калі галоўнаму герою і яго сям'і невыносна цяжка выжываць ва ўмовах безграшоўя, спажывецкага і маральнага дэфіцыту. Вызначальную ролю тут выконваюць учынкі блізкіх Уладзіславу людзей. Брат яго жонкі прывозіць спірт для продажу, сябар сям'і дапамагае зрабіць з гэтага спірту гарэлку ўсё для таго ж продажу. Гандляры з аўтобуса ўгаворваюць Уладзіслава ўсё ж ехаць на гандаль, калі той, адчуўшы боль у сэрцы, вырашае спыніць сваю паездку, сышоўшы з аўтобуса ў Мінску. Уладзіслава жонка, прадчуваючы бяду, спрабуе дагнаць на таксі аўтобус, каб адгаварыць мужа не ехаць у Польшчу, але ў яе не атрымліваецца гэта зрабіць.

І. Шамякін не акрэслівае абставіны аднаго з першых актаў сатанінскай задумы ў адносінах да падзейнай сітуацыі з аповесці: нараджэння Уладзіслава. У гэтым творы падрабязна адлюстроўваецца здзяйсненне фінальных акордаў такой задумы. Але калі ўжо для непасрэднага ўдзелу ў яе выкананні быў абраны менавіта Булаўскі, то, відаць, невыпадковым з'яўляецца той факт, што ён прыйшоў у гэты свет з ужо своеасаблівым трагічным знакам – прыроджаным парокам сэрца. Гэтая хвароба ў сукупнасці з пэўнымі абставінамі паступова падводзіла Уладзіслава да трагічнага фіналу яго жыцця. Сітуацыя, у якой аказваецца галоўны герой аповесці пры яго жыцці (безграшоўе) і яго цела пасля смерці (вандраванне з гандлярамі), сведчыць пра тое, што нездарма для здзяйснення такой трагічнай задумы быў абраны менавіта Булаўскі. Лепшыя людзі, якія сваёй маральнай пазіцыяй у жыцці маглі б супрацьстаяць горшым, адыходзяць у нябыт, пакідаючы жыццёвую прастору для дзеяння гэтым горшым. Пакаранне Узёнтака ў аповесці яшчэ не азначае перамогу над злом. Тася, для якой Булаўскі з'явіўся промнем чысціні ў гэтым злым свеце, у фінале аповесці

збіраецца ісці ў манастыр, аднак пры гэтым яна сутыкаецца са зларадствам з боку Марусі.

Ахарактарызаваныя тут асаблівасці аповесці даюць падставу для правядзення яшчэ адной паралелі з дзённікавымі запісамі пісьменніка, да якіх звярталіся вышэй, – паралелі на прадмет супадзення фактаў прататыпнай рэчаіснасці і фактаў мастацкай прасторы твора.

І. Шамякін характарызуе Уладзіслава Булаўскага як «талстоўца». У дзённікавых запісах пісьменніка чытаем: «Прагна пісаў [«Сатанінскі тур». – А. М.], спяшаўся, як баяўся, што не хопіць часу. Увогуле, прагна жыву. <…> Прагна общаюсь з людзьмі. І люблю іх, людзей. Нават ворагаў сваіх. Талстовец <…>» [1, с. 435]. І. Шамякін надзяляе Булаўскага (літаратурны герой, як і аўтар, аказаўся разгубленым у сітуацыі, якая вымагала сацыяльнага прыстасавання ва ўмовах выжывання) рысамі характару, уласцівымі яму самому. Такое супадзенне назіраецца не толькі ў гэтым эпізодзе, але і ў іншых (з жыцця сям'і Булаўскіх), калі іх параўнаць з фактамі безграшоўя, нястачы, побытавага дыскамфорту перыяду 1990-х гадоў і адносін да ўсяго гэтага ў сям'і самога пісьменніка, на якія ён звяртае ўвагу ў сваіх дзённікавых запісах [1, с. 365, 379, 401, 408, 415, 431]. Такія супадзенні з фактамі прыватнага жыцця пісьменніка і яго героя дапаўняюцца іншымі супадзеннямі мастацкай фактуальнасці твора і прататыпнай прасторы, ва ўмовах якой ён узнік: вывад Івана аб тым, «як хапаюць» (крадуць) у цяперашнім жыцці// вывад пісьменніка «Жах! Грабяць усе, хто можа»; «Усе крадуць. Жах!» [1, с. 362, 443]; злачынная пазіцыя Узёнтака і адпаведныя яго паводзіны – у аповесці// вывад пісьменніка аб «злачынным» нараджэнні «трэцяга саслоўя»; «Большасць мільянераў можна сёння саджаць на лаўку падсудных» [1, с. 395]; злачыннае выкарыстанне свайго службовага становішча Кастусём – начальнікам змены мытнікаў// вывад пісьменніка аб «адкрытым, бесцырымонным» хабарніцтве «90 працэнтаў чыноўнікаў» [1, с. 402]; імкненне большасці герояў аповесці здабыць грошы ва ўмовах сацыяльнага выжывання і страта імі пры гэтым чалавечага аблічча//

«пагоня за грашамі, за доларамі» ў грамадстве, калі ў «думках не застаецца нічога святога» [1, с. 434]; выпіўкі «турыстаў» у аўтобусе з мёртвым Булаўскім// «грандыёзная п’янка», наладжаная спонсарам царквы – фірмай «Хелена Валеры» – у палацы піянераў на Вялікдзень 19 красавіка [1, с. 441]. Гэта толькі тыя фактуальныя супадзенні, якія адносяцца да часу напісання аповесці «Сатанінскі тур».

Такім чынам, асэнсаванне І. Шамякіным формаў і сродкаў выжывання разгубленага чалавека, з аднаго боку, і ўпэўненага ў сабе, з другога, ва ўмовах грамадскага бязладдзя прывяло ў выніку да стварэння ў 1993 годзе такіх аповесцей, як «Сатанінскі тур», «Падзенне», «Адна на падмостках».

Аповесць І. Шамякіна «Сатанінскі тур» – гэта мастацкі паказ не толькі аднаго прыватнага трагічнага факта, які меў месца ў прататыпнай рэчаіснасці. Гэта сфакусаваны погляд аўтара на вынікі сацыяльнага бязладдзя ў іх татальных уплывах на лёсы людзей. У той жа час палярызацыя маральных сіл у гэтым творы прыводзіць да наступнай высновы: маральнае супрацьстаянне ў грамадстве ўсё ж можа мець пазітыўныя вынікі. І ў гэтых адносінах маральнае выпрабаванне для чалавека не праходзіць безвынікова.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Шамякін І. П. Роздум на апошнім перагоне: Дзённікі 1980–1995 гадоў. Мінск: Маст. літ., 1998. С. 362 – 516.

2. Шамякін І. П. Збор твораў. У 23 т. Т. 5. Мінск: Маст. літ., 2011.